Настаўніцкая газета
26 мая 2015 года

# Кіраўніцтва да дзеяння

**Супрацоўніцтва сістэмы адукацыі і Асацыяцыі "БАМАП" у падрыхтоўцы вадзіцеляў-міжнароднікаў працягваецца ўжо не першы год, таму перад кіраўніцтвам адукацыйнай і транспартнай галіны ўжо не стаіць пытанне, як арганізоўваць гэты працэс, а ставіцца задача яго ўдасканалення. Якімі будуць крокі ў гэтым кірунку ў найбліжэйшы час, што новага прыўнясе наступны навучальны год — гэтым пытанням была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя, якая прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У размове прынялі ўдзел прадстаўнікі Асацыяцыі "БАМАП", Міністэрства адукацыі, кіраўніцтва адукацыі рэгіёнаў, навучальных установ, транспартных арганізацый, вучоныя і практыкі. На пасяджэнні прагучалі выступленні першага намесніка міністра адукацыі В.А.Богуша, старшыні Асацыяцыі "БАМАП" М.І.Баравога. Вёў канферэнцыю намеснік генеральнага дырэктара Асацыяцыі "БАМАП" Г.Я.Бальцэвіч.**

Той, хто выпадкова апынуўся ў той дзень ля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, мог стаць сведкам незвычайнага відовішча. На пляцоўцы перад бібліятэкай у магутны рознакаляровы поезд сабраліся аўтафуры самых розных марак. Нядаўна яны вярнуліся з далёкіх краін і прыехалі на гэтую імправізаваную выставу адразу з рэйса. Ля цяжкагрузнай тэхнікі можна было ўбачыць шмат маладых людзей, якія, магчыма, упершыню маглі з такой блізкай адлегласці разглядзець шматтонныя аўтапаязды. Мяркуючы па словах захаплення, па палаючых позірках, для некаторых гэты дзень, напэўна, стане вызначальным у прафесійным выбары і будзе першым крокам да ажыццяўлення мары — каляціць на такім аўтамабільным волаце па краінах і кантынентах.

А для тых, хто займаецца прафесійнай падрыхтоўкай моладзі па гэтай прафесіі, у зале адукацыйных тэхналогій бібліятэкі прайшла навукова-практычная канферэнцыя, дзе прадстаўнікі сістэмы адукацыі нараўне з заказчыкамі кадраў — членамі Асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў "БАМАП" абмяркоўвалі далейшыя крокі ўдасканалення гэтага супрацоўніцтва для больш якаснай падрыхтоўкі вадзіцеляў-міжнароднікаў. У фае размясцілася экспазіцыя шматлікай вучэбна-метадычнай літаратуры, сумесна распрацаванай сістэмай адукацыі і Асацыяцыяй "БАМАП".

Прайшло ўжо 4 гады, як паміж сістэмай адукацыі і Асацыяцыяй "БАМАП" было наладжана ўзаемадзеянне ў прафесійнай падрыхтоўцы кадраў для транспартнай галіны, і трэба сказаць, што прыкладаў такога цеснага супрацоўніцтва навучальных установ і заказчыкаў кадраў за гэты час прыбавілася мала. Таму натуральна, што такое супрацоўніцтва па-ранейшаму выклікае павышаную цікавасць і яго хочацца дэманстраваць іншым галінам і канкрэтным заказчыкам кадраў як кіраўніцтва да дзеяння ў фарміраванні кадравага патэнцыялу сваіх прадпрыемстваў і арганізацый.

— Сёння ў каледжах і ліцэях прафесійна-тэхнічнай адукацыі нашай краіны паспяхова вядзецца падрыхтоўка вадзіцеляў для міжнародных перавозак на бюджэтнай аснове, і за 4 гады падрыхтаваны 700 чалавек, якія гатовы працаваць у нашай транспартнай галіне, — заявіў старшыня Асацыяцыі "БАМАП" М.І.Баравой. — Цяпер мы стаім на шляху ўдасканалення прафесійнай падрыхтоўкі вадзіцеляў-міжнароднікаў і імкнёмся, каб кожны крок і ў далейшым быў выверaны і ўзгоднены з сістэмай адукацыі. Менавіта з гэтай мэтай наша супрацоўніцтва будзе падмацавана чарговым планам сумесных мерапрыемстваў паміж асацыяцыяй і Міністэрствам адукацыі на найбліжэйшыя гады, дзе вызначана стратэгія далейшых сумесных дзеянняў.

— Нам вельмі прыемна адзначаць, што ўжо некалькі гадоў паміж сістэмай прафесійнай адукацыі і транспартнай галінай існуе цеснае ўзаемадзеянне, якое ні разу не перапынілася, а з кожным годам мацнее і ўдасканальваецца, — адзначыў першы намеснік міністра адукацыі В.А.Богуш. — Устанаўленне супрацоўніцтва паміж прафесійнай адукацыяй і работадаўцамі з'яўляецца сёння найважнейшай умовай якаснай падрыхтоўкі кадраў для нашай эканомікі. Кожны заказчык кадраў, які клапоціцца аб будучыні свайго прадпрыемства, аб яго кадравым патэнцыяле, зацікаўлены ў тым, каб атрымаць максімальна падрыхтаваных выпускнікоў з тым наборам ведаў і уменняў, якія адпавядалі б сучасным патрабаванням. І толькі пры цесным супрацоўніцтве нам удасца мінімізаваць выдаткі, якія могуць узнікаць, калі сістэма адукацыі будзе займацца гэтай справай самастойна. Яшчэ большую значнасць набывае такое супрацоўніцтва менавіта цяпер, калі прафесійная адукацыя нашай краіны ўступае, па сутнасці, у новую эпоху свайго развіцця, калі мяняюцца падыходы ў падрыхтоўцы кадраў, звязаныя з увядзеннем нацыянальнай рамкі кваліфікацый, распрацоўкай прафесійных стандартаў.

І.Г.Алісевіч, кансультант упраўлення прафесійнай адукацыі галоўнага міністэрства, пацвердзіла, што ўжо шмат зроблена станоўчага ў арганізацыі падрыхтоўкі вадзіцеляў-міжнароднікаў Асацыяцыяй "БАМАП", Міністэрствам адукацыі, РІПА, кіраўнічымі структурамі рэгіёнаў і ўстановамі адукацыі. Добры вынік дасягнуты дзякуючы сістэмнай, мэтанакіраванай і сплананавай рабоце ўсіх зацікаўленых бакоў. У новым плане сумесных мерапрыемстваў закладзены найбольш актуальныя напрамкі ўзаемадзеяння навучальных устаноў прафесійнай адукацыі і заказчыкаў кадраў. Комплексны план уключае розныя кірункі, у тым ліку ўстанаўленне дагаворных адносін, якія прадугледжваюць мэтавую адрасную падрыхтоўку кадраў для транспартных арганізацый, вызначэнне патрэбнасці ў кадрах, удасканаленне нарматыўнага, прававога і навукова-метадычнага забеспячэння, прафарыентацыйную работу, стварэнне ўмоў для праходжання вытворчага навучання, стажыроўку майстроў вытворчага навучання і выкладчыкаў, працаўладкаванне выпускнікоў навучальных устаноў на рабочых месцах.

Калі прасачыць за ходам развіцця адносін транспартнікаў з сістэмай адукацыі, то відавочна, што за гэтыя гады зроблена нямала.

Арганізацыі, для якіх вядзецца падрыхтоўка кадраў, па меры магчымасці папоўнілі матэрыяльную базу навучальных устаноў дэталямі, вузламі, вучэбнымі дапаможнікамі для выкарыстання ў вучэбным працэсе, прадаставілі метадычную літаратуру, інфармацыйныя стэнды.

Штогод на базе вучэбнага цэнтра "БАМАП-ВЕДЫ" педагагічныя работнікі ўстаноў ПТА праходзяць стажыроўку з правядзеннем практычных заняткаў у пунктах вагагабарытнага кантролю транспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць міжнародныя перавозкі, з вывучэннем парадку афармлення дакументаў на міжнародныя перавозкі грузаў і кантролю за выплатай дарожных збораў. Прадстаўнікі навучальных устаноў штогод запрашаюцца на выставы, конкурсы, круглыя сталы, канферэнцыі, якія праводзіць асацыяцыя, з мэтай трымаць педагагічны склад навучальных установ у курсе спраў, якія тычацца развіцця транспартнай галіны нашай краіны.


М.І.Баравой і В.У.Нядбайла ў час узнагароджання.

Навучэнцы выпускных курсаў устаноў прафесійнай адукацыі запрашаюцца да ўдзелу ў адборачным туры тэарэтычнага этапу конкурсу прафесійнага майстэрства вадзіцеляў магістральных аўтапаяздоў, на якім звычайна паказваюць высокія вынікі па тэорыі навучання.

Значная частка сумеснай работы накіравана на распрацоўку метадычнага забеспячэння навучання. Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі пры непасрэдным удзеле вучэбнага цэнтра "БАМАП-ВЕДЫ" былі распрацаваны і ў далейшым удасканалены вучэбныя планы і праграмы па падрыхтоўцы вадзіцеляў-міжнароднікаў. Нядаўна быў выдадзены вучэбны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі "Міжнародныя аўтамабільныя перавозкі грузаў" і рабочы сшытак для правядзення практычных заняткаў. Асацыяцыяй "БАМАП" быў створаны відэаролік аб рабоце вадзіцеля-міжнародніка, які з'яўляецца ўдалым прафарыентацыйным матэрыялам для папулярызацыі гэтай прафесіі сярод моладзі. У 2014 годзе Асацыяцыя "БАМАП" упершыню праводзіла агляд-конкурс метадычных распрацовак выкладчыкаў устаноў прафесійнай адукацыі па прадмеце "Арганізацыя міжнародных перавозак". Лепшыя з іх былі ўключаны ў метадычны зборнік.

У гэтым годзе актуалізаваны банк тэставых пытанняў для праверкі ведаў навучэнцаў на прафесійную кампетэнтнасць у міжнародных перавозках, які ў электронным варыянце распаўсюджаны ва ўстановах прафесійнай адукацыі. Для аказання дапамогі ў пытаннях падрыхтоўкі кадраў працуе камісія Асацыяцыі "БАМАП" па прафесійным навучанні, якую ўзначальвае кіраўнічы дырэктар таварыства "Освесттранскар", адзін са стваральнікаў вучэбна-метадычнай літаратуры для падрыхтоўкі вадзіцеляў-міжнароднікаў В.П.Ложачнік.

В.А.Богуш заўважыў, што важным элементам якаснай прафесійнай падрыхтоўкі з'яўляецца ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў. Сфарміраваць практычныя навыкі будучых спецыялістаў можна толькі там, дзе прадстаўлена самае сучаснае абсталяванне і ўкараняюцца найноўшыя тэхналогіі. Безумоўна, самым надзейным партнёрам у гэтай справе павінен выступаць заказчык кадраў. Добрым прыкладам гэтага можна назваць узаемадзеянне рэгіянальных навучальных устаноў з прадстаўніцтвамі Асацыяцыі "БАМАП".

А.А.Лунгіс, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Магілёўскага прафесійнага агралесатэхнічнага каледжа імя К.П.Арлоўскага, расказала, што ў многім дзякуючы заказчыкам кадраў у каледжы створаны ўсе ўмовы для асваення прафесіі вадзіцеля-міжнародніка. Вучэбныя кабінеты і лабараторыі аснашчаны неабходнымі нагляднымі дапаможнікамі, дэталямі аўтамабіляў, для атрымання практычных навыкаў на тэрыторыі каледжы існуе аўтадром. Для больш якаснай прафесійнай падрыхтоўкі пэўная частка заняткаў праводзіцца ў прадстаўніцтве Асацыяцыі "БАМАП" у Магілёве. Дырэктар гэтага прадстаўніцтва І.У.Шакайла расказаў, што на яго базе арганізоўваюцца лабараторна-практычныя заняткі для навучэнцаў каледжа па арганізацыі міжнародных перавозак, па праходжанні мытні, па прымяненні мытнага заканадаўства, па ўстройстве і эксплуатацыі аўтамабіля. Вучэбныя праграмы пастаянна абнаўляюцца з улікам змяненняў у мытным айчынным і замежным заканадаўстве. Створана сістэма кантролю ведаў, якая дазваляе вызначыць узровень падрыхтоўкі навучэнцаў. Для практычнага асваення прафесіі, для адаптацыі навучэнцаў у калектыве свае плошчы прадастаўляюць аўтатранспартныя прадпрыемствы Магілёва. За вытворчую практыку навучэнцы атрымліваюць 100-працэнтную аплату.

Па словах В.А.Богуша, адным з галоўных напрамкаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаванага спецыяліста з'яўляецца метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу. Гэтую работу звычайна бярэ на сябе сістэма адукацыі, але сёння не абысціся і без работадаўцаў, якія павінны дапамагаць у фарміраванні зместу навучання. Такую дзейсную дапамогу аказваюць прадстаўнікі Асацыяцыі "БАМАП". Гэтае ўзаемадзеянне можна назваць калектыўнай творчай лабараторыяй. Значны ўклад у арганізацыю падрыхтоўкі вадзіцеляў-міжнароднікаў па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі, навукова-метадычнага суправаджэння ўносіць Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі сумесна з транспартнымі арганізацыямі. Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце інстытута, кандыдат педагагічных навук, дацэнт М.В.Ільін пацвердзіў, што члены асацыяцыі разам з прадстаўнікамі сістэмы адукацыі дакладна пралічваюць тыя крокі, якія вядуць да падрыхтоўкі менавіта таго спецыяліста, які патрэбен у транспартнай арганізацыі. І тут гаворка ідзе не толькі аб кампетэнтнасці, але і аб фарміраванні асобы работніка, які з'яўляецца не проста вадзіцелем, а прадстаўніком нашай дзяржавы за мяжой, — гэта твар нашай краіны.

Сёння вядзецца актыўная работа па распрацоўцы прафесійных стандартаў, якія з'яўляюцца асновай для вызначэння прафесійнага ўзроўню і ўдасканалення прафесійных кампетэнцый работнікаў і іх сертыфікацыі. Патрабаванні прафесійнага стандарту выкарыстоўваюцца пры складанні адукацыйных стандартаў і праграм і вучэбна-метадычных матэрыялаў, а таксама пры выбары форм і метадаў навучання ў сістэме прафесійнай адукацыі. У прафесійны стандарт транспартнай сферы будуць закладзены ўсе кампетэнцыі, якія ўласцівы прафесіі вадзіцеля-міжнародніка, прапісаны кожны крок навучання. Гэта дазволіць сфарміраваць яго прафесійны і сацыяльны статус. Для забеспячэння больш якаснай прафесійнай падрыхтоўкі пашыраецца сетка рэсурсных цэнтраў, у тым ліку траспартнага профілю. Сёння ўжо дзейнічаюць такія цэнтры ў ПТК РІПА і Вілейскім дзяржаўным каледжы. На чарзе адкрыццё такой структуры ў Мінскім аўтамеханічным каледжы.

Сёння актыўна вядзецца падрыхтоўка падручніка для навучання будучага вадзіцеля-міжнародніка. Мяркуецца, што ён з'явіцца да пачатку новага навучальнага года. Аўтарамі гэтага выдання сталі Я.Л.Савіч, прафесар кафедры "Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў" аўтатрактарнага факультэта БНТУ, і прадстаўнікі Асацыяцыі "БАМАП".

У сваім выступленні дырэктар вучэбнага цэнтра "БАМАП-ВЕДЫ" Г.Б.Дашкевіч адзначыў важнасць укаранення новых больш сучасных і эфектыўных сродкаў навучання, якія б давалі магчымасць для большай нагляднасці вучэбнага працэсу і тым самым у большай ступені зацікаўлівалі навучэнцаў. Гэта могуць быць відэафільмы, анімацыя, сімулятары. Шмат новых тэхналогій прапаноўваюць замежныя аўтары. Г.Б.Дашкевіч расказаў аб выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій, аб праектах і праграмах навучання, якія прапаноўвае Акадэмія міжнароднага саюза аўтамабільнага транспарту (МСАТ), Жэнева (Швейцарыя) па ўдасканаленні вучэбнага працэсу ў падрыхтоўцы вадзіцеляў-міжнароднікаў. Прагучала меркаванне стварыць лабараторыю па вытворчасці сучасных наглядных сродкаў. Адносна далейшых кірункаў супрацоўніцтва было адзначана, што прадстаўніцтвы Асацыяцыі "БАМАП" сумесна з кіраўнікамі транспартных арганізацый у рэгіёнах павінны больш актыўна ўдзельнічаць у мерапрыемствах, што праводзяцца навучальнымі ўстановамі, і ў першую чаргу прафарыентацыйных, з дапамогай якіх павышаецца прэстыж прафесіі вадзіцеля-міжнародніка. Магчыма, найбольшую ролю ў гэтым могуць адыграць сустрэчы з вопытнымі вадзіцелямі, якія шмат гадоў аддалі міжнародным перавозкам і асабістым прыкладам маглі б зацікавіць моладзь гэтай прафесіяй. Стаіць пытанне і аб больш актыўным удзеле транспартных арганізацый у ажыццяўленні адукацыйнага працэсу ва ўстановах прафесійнай адукацыі, іх пастаянным удзеле ў рабоце камісій па правядзенні выніковай атэстацыі навучэнцаў, у размеркаванні і працаўладкаванні выпускнікоў. Неабходна аказваць садзейнічанне ў педагагічнай дзейнасці ўстаноў, накіроўваць вопытных работнікаў для правядзення вучэбных заняткаў у групах вадзіцеляў-міжнароднікаў, дапамагаць у арганізацыі вытворчага навучання і практыкі на прадпрыемствах, уносіць прапановы па ўдасканаленні вучэбных планаў і праграм.

Галоўны спецыяліст Асацыяцыі "БАМАП" Т.А.Ястраб паведаміла, што сёлета былі распрацаваны паказчыкі для ўзнагароджання лепшых прадстаўнікоў Асацыяцыі "БАМАП" і сістэмы прафесійнай адукацыі. Згодна з распрацаваным палажэннем, прадстаўлены пераможцы ў трох намінацыях.

М.І.Баравой уручыў дыплом у намінацыі "Лепшая базавая арганізацыя-2015" за эфектыўнае супрацоўніцтва з Пінскім прафесійна-тэхнічным каледжам машынабудавання па падрыхтоўцы вадзіцеляў-міжнароднікаў кіраўніку Брэсцкага аўтапрадпрыемства "Веставта" С.І.Бурак. У намінацыі "Лепшая ўстанова адукацыі-2015" узнагароду атрымаў калектыў Магілёўскага прафесійнага аграрэсатэхнічнага каледжа імя К.П.Арлоўскага. Лепшым выкладчыкам гэтага года прызнаны В.У.Нядбайла з Пінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа машынабудавання.

Ала КЛЮЙКО.
kliuiko@ng-press.by